**Кобрынская цэнтральная раённая бібліятэка**
**Аддзел бібліятэчнага маркетынгу**
**Хроніка**
**культурнага жыцця бібліятэк г. Кобрына і раёна за лістапад 2021 г.**

У бібліятэках сістэмы прайшоў краязнаўчы месячнік «Чытая Радзімы старонкі». У рамках месячніка адбылася акцыя «Чытаем беларускую кнігу» па папулярызацыі беларускай літаратуры. У бібліятэках сістэмы арганізаваны кніжныя выставы «Мая Беларусь», «Родная мова – крыніца празрыстая», «На мове сэрцу зразумелай».

**18 лістапада**

У інфармацыйна-сэрвісным цэнтры бібліятэкі прайшла свяцёлка літаратурная «Традиции живая нить». Гасцямі мерапрыемства сталі навучэнцы Кобрынскага дзяржаўнага політэхнічнага каледжа.

Прысутныя пазнаёміліся з народнымі святамі беларускага календара, з нацыянальнай кухняй беларусаў, з традыцыйным народным беларускім адзеннем. Асаблівы акцэнт вядучыя зрабілі на кобрынскі лад жаночага касцюма – касцюм свахі в. Лелікава, які ў 2018 годзе, як элемент нематэрыяльнай культурнай спадчыны «Традиции изготовления и использования костюма Леликовой свахи» быў уключаны ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцяў Рэспублікі Беларусь.

Скончылася мерапрыемства віктарынай «Родники народные».

ЦБ, 30 чал.

**18 лістапада**

Адбылася гадзіна зносін «Родного края разноцветье». Юныя карыстальнікі з цікавасцю пазнаёміліся з выставамі, якія арганізаваны ў бібліятэцы і прысвечаны роднаму краю, пазнаёміліся з кнігамі пра родны край, атрымалі заданне падрыхтаваць кароткі расказ пра знакамітых людзей вёскі Астромічы.

Астроміцкая ПБ, 15 чал.

**18 лістапада**

Гульня-віктарына «Знатоки родного края» прайшла ў выглядзе каманднага спаборніцтва, дзе кожны з вучняў старэйшых класаў змог паўдзельнічаць ў розных конкурсах і віктарынах на замацаванне ведаў аб роднай вёсцы Навасёлкі і аб Беларусі (дзяржаўная сімволіка, жывёльны і раслінны свет). У канцы ўсе дзеці атрымалі салодкія падарункі.

Навасёлкаўская ПБ, 14 чал.

**19 лістапада**

Выступленне ЛПГ «Крыніца» прайшло пад дэвізам «Роднаму краю – часцінку душы прысвячаю». Удзельнікі групы прадставілі вучням відэапрэзентацыю аб гісторыі вескі Імянін, правялі віктарыну «Што мы

ведаем аб роднай весцы». Да мерапрыемства падрыхтавана кніжная выстава «Мой родны край – мая гісторыя жывая»

Імянінская ПБ, 19 чал.

## Мерапрыемствы ў рамках акцыі «Полезные каникулы»

У бібліятэкі сістэмы разасланы спісы непаўналетніх дзяцей, якія знаходзяцца на ўліку ў інспекцыі па справах непаўналетніх і ў сацыяльна небяспечным становішчы. Бібліятэкі ладзяць індывідуальную работу з дзецьмі данай катэгорыі.

**2 лістапада – 6 лістапада**

У дні восеньскіх канікул бібліятэкар падрыхтавала і правяла цыкл займальных мерапрыемстваў. Дзеці ўдзельнічалі ў гульнях «Грибная карусель», «Осенняя палитра» і бібліадартсе «Знаешь – отвечай, не знаешь – прочитай». Усе заданні былі разлічаны на тое, каб праверыць веды дзяцей пра прачытаныя імі казкі. Дзеці з задавальненнем ўдзельнічалі ў розных конкурсах і віктарынах. Усе ўдзельнікі мерапрыемстваў атрымалі салодкія прызы.

Гарадзецкі філіял, 25 чал

**5 лістапада**

Бібліятэка сумесна з сельскім клубам запрасілі выхаванцаў прышкольнага аздараўленчага лагера «Галактика радости» на пазнавальна-забаўляльную праграму «Жили-были».

Дзеці з задавальненнем ўдзельнічалі ў конкурсах «Волшебные предметы», «Собери сказочного героя», адгадвалі загадкі, з гумарам адказвалі на пытанні віктарыны. Усе ўдзельнікі атрымалі салодкія прызы.

Кіселявецкая ПБ, 35 чал.

## Іншыя мерапрыемствы

**12 лістапада**

У бібліятэцы адбылася інфармацыйная гадзіна «Так цудоўна жыць на свеце без курэння», на якой бібліятэкар пазнаёміла ўдзельнікаў з гісторыяй з'яўлення тытуню і цыгарэт і праінфармавала аб тым, колькі ў свеце пакутуе і гіне людзей ад гэтай згубнай звычкі, прывёўшы гістарычныя даведкі шляхоў распаўсюджвання тытуню па свеце. Прысутныя даведаліся аб страшных наступствах курэння, аб тым, што чалавек, які паліць, прыносіць шкоду не толькі сабе, але і наваколлю.

Лукская ПБ, 13 чал.

**17 лістапада**

У бібліятэцы прайшоў экалагічны ўрок «Нам есть, что сказать о богатстве природы». Дзеці пазнаёміліся з краявіднай разнастайнасцю прыроды і пагаварылі пра яе значэнне для чалавека. Разам з бібліятэкарам дзеці пазнаёміліся з Чырвонай кнігай Беларусі і абмеркавалі, што кожны можа зрабіць для аховы навакольнага асяроддзя.

Прысутныя адказалі на пытанні тэсту «Умеешь ли ты охранять природу?», прынялі ўдзел у гульнях «Друг и недруг природы», «Живая и неживая природа», разгадалі тэматычныя загадкі. Скончылася мерапрыемства праглядам відэазаняткаў «Как сделать кормушки для птиц» і «Чем кормить птиц зимой». Кожны з удзельнікаў даў абяцанне зрабіць кармушку для птушак разам са сваімі бацькамі.

Акцябрская ПБ, 17 чал.

**20 лістапада**

Творчыя сустрэчы з членамі літаратурнага клуба «ПоэтиКо», які працуе пры цэнтральнай раённай бібліятэцы, Наталляй Кандрашук і Аленай Котавай адбыліся ў сярэдняй школе № 9 г. Кобрына.

Паэтэсы выступалі перад вучнямі, але ў розных класах. Яны чыталі свае творы, праводзілі літаратурныя гульні і спаборніцтвы. Для вучняў сюрпрызам стала тое, што член Саюза пісьменнікаў і кіраўнік літаратурнага клуба «ПоэтиКо» Наталля Кандрашук яшчэ і маці іх класнага кіраўніка Ігара Ніжніка, які таксама з'яўляецца членам клуба.

ЦБ, 19 чал.

*(Кобрин-информ. 2021. 25.11)*

**21 лістапада**

Пасяджэнне літаратурнага клуба «ПаэтыКо» прайшло ў фармаце літаратурнай анлайн-лабараторыі «Сонеты». Паэты дзяліліся адзін з адным сваімі паэтычнымі і празаічнымі творамі і вучыліся пісаць санеты. Да кобрынскіх літаратараў далучыўся брэсцкі паэт Міхаіл Краў.

ЦБ, 15 чал.

**25 лістапада**

Залеская публічная бібліятэка сумесна з Цэнтрам культуры і вольнага часу працягнулі добрую традыцыю правядзення духоўна-асветніцкіх чытанняў «Православная азбука. Любовь». Навучэнцы старэйшых класаў і настаўнікі ўважліва праслухалі расказ ігумена Петрапаўлаўскай царквы айца Аляксандра, абмеркавалі, як жыць па асноўных запаведзях у сучасным свеце, як навучыцца аддаваць, ахвяраваць, кахаць усіх, хто жыве вакол нас. Выступаючыя скарысталі матэрыялы выставы «Книжный мир православия», В. Глазунова выступіла з вершамі і паказала відэапрэзентацыю «Всё начинается с любви».

Залесская ПБ, 20 чал.

Е.И. Зыбайло
3 85 81